# АБ'ЯДНАНЫЯ ІДЭЯЙ

**У Мінску скончыўся беларуска-кітайскі міжнародны конкурс-фестываль «Мастацтва шаўковага шляху»**



Шматгадовае сяброўства Беларусі і Кітая будуецца не толькі дзякуючы палітычнаму, але і культурнаму ўзаемадзеянню. Неаднойчы ў абедзвюх краінах праводзіліся самыя розныя творчыя мерапрыемствы, дзякуючы якім раскрываўся патэнцыял прадстаўнікоў як Беларусі, так і Кітая. Сёлета адбылася важная падзея: у Мінску з 29 па 31 ліпеня прайшоў І Беларуска-кітайскі міжнародны конкурс-фестываль «Мастацтва шаўковага шляху», які аб'яднаў больш за сотню ўдзельнікаў — прадстаўнікоў розных творчых напрамкаў. Арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

Танцоры, музыканты-інструменталісты і вакалісты... Сярод удзельнікаў — як прафесіяналы, так і аматары. Мэта кожнага — прадэманстраваць асаблівасці сваёй нацыянальнай культуры, а таксама зразумець, чым жа цікавая і ўнікальная культура краіны-сябра. На працягу трох дзён моладзь Беларусі і Кітая актыўна брала ўдзел у такіх мерапрыемствах, як конкурс інструментальнай музыкі і народнага танца. Бонус — магчымасць наведаць майстар-класы па народнай творчасці.

— Мерапрыемствы, арганізаваныя ў межах фестывалю, садзейнічалі ўзаемадзеянню, абмену творчымі ідэямі, — падкрэслівае рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Аліна Корбут. — Удзельнікі фестывалю — моладзь, якая разумее, чаму сёння важна падтрымліваць стасункі, якая ўмее думаць і бачыць на крок наперад. Мне асабліва прыемна, што ўсе паставіліся да фестывалю з адказнасцю і прадэманстравалі гледачам якаснае музычнае, тэатральнае і вакальнае мастацтва.

Фестываль «Мастацтва шаўковага шляху» стаў тым адукацыйным праектам, які здолеў закласці глебу на многія гады наперад. Удзельнікі паабяцалі ў наступным годзе таксама сабрацца разам, каб адчуць моцную творчую энергетыку, якой быў прасякнуты фэст сёлета.

— У кожнай краіны ёсць свае традыцыі і каштоўнасці. Ды важна іх не толькі ведаць, але і захаваць. Беларусь — той самы прыклад, калі ёсць чым ганарыцца, — адзначае прадстаўнік кітайскай дэлегацыі Дай Вэнцдзі. — Я прыехаў да вас упершыню, аднак ёсць жаданне застацца і даведацца яшчэ шмат цікавага пра вашу краіну. Дзякуючы гэтаму фестывалю ў многіх прадстаўнікоў Кітая з'явіўся стымул глыбей пазнаёміцца з культурай Беларусі.

Пакуль госці знаходзілі цікавыя факты пра нашу краіну, мясцовыя ўдзельнікі паглыбіліся ў свет таямніц кітайскай культуры: вывучылі некалькі народных танцаў і нават паспрабавалі паспяваць на кітайскай мове. Дарэчы, у наступным годзе фестываль павінен адбыцца ўжо ў Кітаі.

**Вікторыя АСКЕРА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ